# ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ ТВОРЧАСЦЬ НА СТАРОНКАХ ЧАСОПІСА «БЯРОЗКА»

## Агляд тэм, праблем, вобразаў, прадстаўленых юнымі пісьменнікамі



**Д. П. Зылевіч,**
дацэнт кафедры
рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій
Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага
ўніверсітэта,
кандыдат філалагічных навук

**Ю. П. Манкевіч,**
студэнт 3 курса
факультэта прынттэхналогій і медыякамунікацый
Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта



**Творы, напісаныя дзецьмі, рэдка прыцягваюць увагу навукоўцаў. Між тым такое даследаванне магло б прынесці несумненную карысць і педагогам, і бацькам, і псіхолагам для разумення каштоўнасцей, кола захапленняў, перажыванняў нашых юных суграмадзян.**

**Асаблівую ролю ў папулярызацыі дзіцячай творчасці адыгрывае часопіс «Бярозка», дзе на працягу многіх гадоў друкуюцца вершы, казкі, апавяданні, эсэ, дасланыя чытачамі, штогод абвяшчаюцца літаратурныя конкурсы, праводзяцца майстар-класы з удзелам беларускіх пісьменнікаў.**

### ✍ Спецыфіка выдання

На старонцы «ВКонтакте» чытаем: «Бярозка» – інтэлектуальны падлеткавы часопіс для тых, хто хоча арыентавацца ў сучаснай культурнай прасторы, ведаць мінулае Беларусі, актыўна ўдзельнічаць у сацыяльных і творчых праектах і ствараць свае. Дзяліцеся сваёй творчасцю ці хвалюючым і жыццёвым, сваім поглядам на грамадскія і сацыяльныя праблемы як Беларусі, так і свету, магчыма, нечым асабістым і шчымлівым, што можна выказаць радком сціплага верша ці радкамі нават крыху і нясціплага ў памерах эсэ. Хто на што здатны, ды да чаго душа ляжыць! Стань і ты аўтарам часопіса!»

Хочацца адзначыць зладжаную работу аўтараў, рэдактараў, мастакоў, вярстальшчыкаў – усіх, хто стварае часопіс «Бярозка». Ён выглядае якасна і сучасна, адпавядае свайму мэтаваму прызначэнню (літаратурны і грамадска-палітычны часопіс) і чытацкай аўдыторыі (падлеткі). Думаецца, яго можна назваць «тоўстым часопісам» для беларускіх падлеткаў. «Тоўсты часопіс» у «Слоўніку рускай мовы» трактуецца як «перыядычны (звычайна штомесячны) літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны часопіс, значны па аб'ёме» [1].

Літаратурна-мастацкія часопісы знаёмяць чытача з навінкамі арыгінальнай або перакладной літаратуры і літаратурнага жыцця, спрыяюць фарміраванню грамадскай думкі. Ю. А. Галавін падкрэслівае, што дамінуючай тыпалагічнай прыкметай, якая вызначае літаратурна-мастацкі часопіс, з'яўляецца наяўнасць у ім літаратурна-мастацкіх тэкстаў, прычым пераважных у часопісе як якасна, так і колькасна, што вылучае яго з іншых сродкаў масавай інфармацыі і дазваляе разглядаць як выданне мастацкай літаратуры [2].

Нягледзячы на велізарную колькасць электронных гаджэтаў і папулярнасць электронных кніг, нельга сказаць, што «тоўстыя часопісы» неактуальныя для падлеткаў. Па-ранейшаму ёсць маладыя людзі, якім важна трымаць кнігу або часопіс у руках. (Дарэчы, ёсць «Бярозка» і ў электронным варыянце.)

У цяперашні час існуе некалькі падыходаў да даследавання такога феномену, як літаратурна-мастацкі часопіс: журналісцкі, культуралагічны і літаратуразнаўчы. З пункту гледжання *журналістыкі* «тоўсты часопіс» – гэта сродак адлюстравання асноўных падзей эпохі, перадачы настрою грамадства. Адпаведна *культуралагічнаму падыходу* «тоўсты часопіс» – элемент культуры, які выконвае функцыі сацыяльна-духоўнага адлюстравання эпохі, а таксама фарміравання новай, іншай літаратуры. Выкарыстанне прынцыпаў *літаратуразнаўчага аналізу* прадугледжвае вывучэнне тэматыкі, праблематыкі, жанравай і кампазіцыйнай своеасаблівасцей мастацкіх твораў, што публікуюцца ў часопісе.

У дадзеным артыкуле намі выкарыстаны культуралагічны і літаратуразнаўчы падыходы да аналізу кантэнту старэйшага беларускага дзіцячага часопіса «Бярозка».

## ✍ Дыяпазон тэматыкі і жанраў

На старонках часопіса «Бярозка» можна знайсці творы беларускіх і замежных пісьменнікаў, публікацыі сацыяльнага, культурнага і гістарычнага характару, матэрыялы пра дзейнасць падлеткавых арганізацый і рухаў, пастаянныя рубрыкі для геймераў і кінаманаў. Па сутнасці, гэта інтэлектуальны беларускамоўны глянец для падлеткаў.

Сёння мы прапануем вашай увазе агляд тэм, праблем, вобразаў, якія найчасцей трапляюць у поле зроку сучасных беларускіх падлеткаў. Аб'ект нашага даследавання – нумары часопіса «Бярозка» за 2020 г. і першае паўгоддзе 2021 г.; прадмет – змест рубрыкі «Заяўка на Парнас», дзе друкуюцца творы, дасланыя юнымі аўтарамі.

Зразумела, што рэдакцыя часопіса накіроўвае ўвагу чытачоў на пэўныя тэмы, калі абвяшчае літаратурныя конкурсы. А такіх нямала. Прысвечаны яны розным падзеям. Напрыклад, у 2018 г. пры падтрымцы Праграмы развіцця ААН быў праведзены конкурс на тэму «17 мэтаў: ведаем і ўвасабляем!» «Распавядзіце, як вы разумееце Праграму ўстойлівага развіцця? Як вы, ваша сям'я, сябры, знаёмыя яе прытрымліваюцца ці не прытрымліваюцца? Што можа яшчэ зрабіць кожны з нас, каб палепшыць жыццё на Зямлі? Гэтая праграма – не проста словы. Яна наўпрост датычыцца нашага жыцця – кожнага з нас», – чытаем на старонцы «ВКонтакте».

У верасні 2019 г. «Бярозка» прапанавала сваім чытачам «змяшаць фантазію з рэальнай гісторыяй» і паўдзельнічаць у конкурсе «Дзёрзкія тэорыі беларускасці: мова, культура, гісторыя, міф». У цэнтры ўвагі апынулася безэквівалентная лексіка, уласнабеларускія фразеалагізмы, дыялектызмы і іншыя словы, абумоўленыя ўнікальнай лакальнай культурай. Падлеткі атрымалі магчымасць паразважаць, як утварыліся тыя ці іншыя словы і выразы, чаму яны ўзніклі менавіта ў Беларусі.

У 2020 г. рэдакцыя абвясціла конкурс дэтэктыўных гісторый. У першым паўгоддзі друкаваўся «Практыкум» Ксеніі Шталенковай (аўтара кнігі-фэнтэзі «Адваротны бок люстра», шэраг глаў якой таксама ўпершыню быў размешчаны на старонках «Бярозкі») з парадамі, «як напісаць дэтэктыў і не здзейсніць злачынства». Дзеці маглі кіравацца канкрэтнымі метадычнымі рэкамендацыямі і праявіць уласную фантазію і літаратурны талент.

У 2021 г. часопіс «Бярозка» выступае інфармацыйным партнёрам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў правядзенні конкурсу «Беларускі салавей», прысвечанага 135-годдзю з дня нараджэння Змітрака Бядулі. Аўтарам-пачаткоўцам трэба напісаць эсэ з сюжэтнай лініяй па адным з указаных твораў беларускага пісьменніка: можна прапанаваць альтэрнатыўны варыянт развіцця падзей твора або развіць пэўныя эпізоды ці лёсы другарадных герояў.

Прыведзеныя прыклады сведчаць аб шырокім тэматычным дыяпазоне літаратурных конкурсаў. Аднак чытачы «Бярозкі» не абмяжоўваюцца прапановамі рэдакцыі і заяўляюць уласныя тэмы.

У рубрыцы «Заяўка на Парнас» друкуюцца вершы юных паэтаў. Асноўныя тэмы – прырода і падлеткавыя праблемы.

У лепшых традыцыях Рыгора Остэра дзеці складаюць і вершаваныя «шкодныя парады» (№ 1 за 2021 г.). Аднак празаічных твораў значна больш. Найчасцей дзеці-пісьменнікі звяртаюцца да жанру казкі. Так, Альжбэта Малішэўская-Спрынчан у вясёлай казцы «Сузор'е вожыка» распавядае пра вожыка-біёлага, які прыбраў зорную дыскрымінацыю (№ 3 за 2020 г.). Гэтай жа аўтарцы належыць філасофская казка «Чароўна-чырвоны гіль», якая натхняе на жыццёвы аптымізм: «Калі падаецца, што жыццё скончанае, проста павер у цуд – і да цябе прыляціць гіль. Вось толькі калі і ў якім выглядзе – загадка».

Шмат апублікаваных у часопісе твораў прысвечана беларускай лексіцы. Крысціна Мінакова ў «Новай гісторыі для брацікa» (№ 8 за 2020 г.) расказвае, адкуль пайшло слова «ландарак» і што яно абазначае: «З тых часоў у нашай ваколіцы гультаёў і тых, хто дбае толькі пра сябе, называюць ландаракамі». У гэтым жа нумары апублікаваны твор Андрэя Чарнічэнкі «Казка для брата», дзе распавядаецца аб сіле роднай мовы. Слова тут – ключавы персанаж, які дапамагае людзям справіцца з усімі цяжкасцямі, дае ім энергію, звязвае пакаленні між сабой. Многія спрабавалі знішчыць Слова, каб людзі аслабелі і каб займець над імі

поўную ўладу. Але яно працягвае жыць у вершах, песнях і ў нашых сэрцах.

Яна Дзягілева з цеплынёй піша пра дыялектную лексіку (№ 3 за 2020 г.) у апавяданні «Цудоўныя словы маёй бабулі». Дзяўчынка тлумачыць значэнне слоў «піскляты», «гладамара», «застудзіна», «суднік», «чубэркі», даказваючы, што дыялектная лексіка заўсёды матываваная, а яе значэнне відавочнае для носьбітаў.

У казцы «Вожык і Ліса» (№ 10 за 2020 г.) Ксенія Мінькова выкарыстоўвае шмат беларускіх слоў, значэнне якіх для большасці чытачоў невідавочнае («шаршатка», «яндоўка» і інш.). Словы гэтыя вылучаны ў тэксце курсівам: чытачам прапануецца падумаць над імі, пашукаць інфармацыю аб тым, што яны абазначаюць і як утварыліся.

Свае тэорыі аўтары маглі дасылаць на электронны адрас часопіса з перспектывай размяшчэння лепшых з іх на старонках у «ВКонтакте» і Instagram.

Смела бяруцца аўтары часопіса за стварэнне дэтэктыўных апавяданняў. У творы Настассі Квач «Андрэйка-дэтэктыў» расказваецца пра расследаванне справы аб знікненні рыбы, а ў творы Антона Паваланскага «Шлях скіпетра» – аб прапажы скіпетра Яраслава Мудрага з музея «Гісторыя Русі».

Вынаходліва рэалізуюць юныя пісьменнікі і сваю прыхільнасць да фантастыкі. Так, у № 5 за 2021 г. Вольга Качэрга ў апавяданні «Палёт на Архізімус» разважае аб неабходнасці дбаць пра будучыню: «Як аказалася потым, ледзяной гэта планета была не заўсёды. Зрабіў яе такой чалавек, які бяздумна ставіўся да сваіх учынкаў, знішчаў усё жывое, не думаючы пра будучыню. Будучыню, якая можа і не наступіць». А ў № 12 за 2020 г. Карына Ярашэнка ў сатырычнай п'есе «Ад Сакрата да Ютуба» апісвае «рэальнае жыццё ў віртуальным свеце», дзе суіснуюць сучасная дзяўчынка Біка і яе прапрапрапрабабуля Францішка Уршуля.

Творы, дасланыя пісьменнікамі-дзецьмі і надрукаваныя за апошнія паўтары гады ў часопісе «Бярозка», вылучаюцца шырокім тэматычным дыяпазонам: фантастыка, філасофія, алегорыя, гісторыя, легенды, народны побыт, беларуская лексіка, незвычайныя здарэнні, гісторыі жыцця хатніх любімцаў. Самыя розныя і героі гэтых твораў: дзеці, дарослыя, міфалагічныя істоты, жывёлы, нават абстрактныя паняцці. Нягледзячы на невялікі аб'ём публікацый, аўтарам удаецца раскрыць вобразы герояў сваіх казак, апавяданняў, эсэ, пераканаўча апісаць мясцовасць, дзе адбываюцца падзеі, падкрэсліць дэталі, якія дапамагаюць чытачу паглыбіцца ў сюжэт. Кожная публікацыя пад рубрыкай «Заяўка на Парнас» суправаджаецца маляўнічымі ілюстрацыямі.

Падводзячы вынік нашага агляду, звернемся да даследаванняў расійскага пісьменніка і педагога Ю. В. Казарына. Літаратурна-мастацкі часопіс ён разглядае як адзінку літаратуры (сукупнасці тэкстаў), метатэкст. Часопісны метатэкст, паводле сцвярджэння даследчыка, – гэта комплекс аднамоўных тэкстаў, якія фарміруюць у часопісе ўстойлівую жанрава-тэматычную сістэму, што аб'ядноўвае празаічныя, гістарычныя, публіцыстычныя, паэтычныя, навукова-папулярныя тэксты ў адно кампазіцыйнае, сэнсавае, ідэйнае, этыка-эстэтычнае цэлае.

Аналіз выпускаў часопіса «Бярозка» за 2020 г. і першае паўгоддзе 2021 г. дае падставу для сцвярджэння, што тэксты рубрык фарміруюць устойлівую жанрава-тэматычную сістэму, а значыць, метатэкст, які дазваляе падлетку сачыць за сучаснай беларускай літаратурай і пры жаданні і наяўнасці пэўных здольнасцей стаць яе стваральнікам.

Думаецца, больш актыўнае выкарыстанне настаўнікамі часопіса «Бярозка» ў пазашкольнай рабоце стымулявала б падлеткаў ствараць уласныя творы на беларускай мове, выказваць свае думкі аб істотных аспектах сучаснага жыцця. Закончыць артыкул хацелася б словамі юнай пісьменніцы Лізаветы Салдаценка з яе легенды пра горад Ружаны: «Бо няма ў стагоддзях таго, што магло б знікнуць або забыцца; у святле бясконцасці кожны позірк, кожнае слова мае сваю вагу, і тым больш чалавек з яго гісторыяй і думкамі не можа ў ім быць пакінуты без увагі. І гэты край, як і кожны край, помніць тых, што прайшлі яго дарогамі ў даўніну, помніць кожны храм і кожнае поле ў квецені, кожны лісцік, камень, адбітак матылька ў дрыготкім люстры аднаго са шматлікіх азёраў. Ён помніць, і нішто ў яго памяці не знікне, і мо праўда адродзіцца ў адзін час і кветка, і камень, і думка, бо што яшчэ, як не веліч, прыгажосць і бясконцая ў моцы сваёй любоў заслугоўваюць быць вечнымі?»

## ЛІТАРАТУРА


1. **Современный русский язык:** в 4-х т. / РАН, Институт лингвистических исследований; под ред. А. П. Евгеньевой. – М.: Полиграфресурсы, 1999.
2. **Головин, Ю. А.** Российские литературно-художественные журналы в системе культурной политики: содействие, компромисс, противостояние: автореф. дис. ... д-ра культурологии:24.00.01 / Ю. А. Головин. – М., 2010.
3. **История печати:** учеб. пособие для вузов по напр. подг. бакалавров и магистров «Журналистика» и спец. «Журналистика»: в 2 т. / сост., предисл. и коммент. Е. М. Засурского, А. Л. Вартановой. – М.: Аспект-пресс, 2001. – Т. 2: Антология.